# I

# Ад пачатку да сучаснасці

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гісторыя кафедры беларускай літаратуры як асобнага вучэбна-навуковага падраздзялення пачынаецца з 4 кастрычніка 1947 года, калі згодна загаду № 183 па Магілёўскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя І.Д.Папаніна[1] (цяпер — Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А.Куляшова) яна была выдзелена са складу кафедры літаратуры. Загадам № 185 ад 7 кастрычніка таго ж года[2] быў зацверджаны штат выкладчыкаў. Аднак, як сведчаць дакументы, працаваць самастойна кафедра пачала толькі з 1 снежня 1947 года[3].

Першапачатковы асабовы склад кафедры быў невялікі; загадчыкам (адначасова і дэканам літаратурнага факультэта) быў Мікалай Міхайлавіч Пятровіч, які пасля заканчэння аспірантуры пры Інстытуце літаратуры АН БССР з 1933 года, акрамя перыяду Вялікай Айчыннай вайны, выкладаў беларускую літаратуру ў гэтым жа Магілёўскім педінстытуце; Марыя Андрэеўна Нікіціна, якая закончыла літфак Магілёўскага педінстытута ў 1945 годзе, выконвала абавязкі дацэнта, чытала курсы рускага і беларускага фальклору; асістэнт Валянціна Рыгораўна Старасотнікава, выпускніца літфака Магілёўскага педінстытута (1946 г.), працуючы асістэнтам, праводзіла спачатку галоўным чынам практычныя заняткі па гісторыі беларускай літаратуры, а пазней, да пераходу ў 1960 г. на іншае месца працы, чытала і курс методыкі выкладання беларускай літаратуры.

Дыпламаваных спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі сярод выкладчыкаў кафедры тады яшчэ не было, але яны працавалі над павышэннем кваліфікацыі. Маладзейшыя выкладчыкі здавалі экзамены кандыдацкага мінімуму; загадчык кафедры працаваў над завяршэннем дысертацыі.

[1] Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. — ф. 927, — воп. 1.— адз. зах. 56. — л. 290.

[2] Там жа. — л. 292.

[3] Там жа. —адз. зах. 70. — л. 66.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У 1948 — 1949 навучальным годзе Міністэртва асветы перавяло М.М.Пятровіча на іншую працу, а на яго месца накіравала выпускніка аспірантуры пры Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР Якуба Кірылавіча Усікава. Перайшла на кафедру рускай літаратуры М.А.Нікіціна. З верасня 1949 г. па накіраванні таго ж Міністэрства на кафедры пачаў працаваць Аляксадр Антонавіч Макарэвіч. Да таго ён два гады правучыўся ў аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце і быў адлічаны толькі за тое, што пры паступленні не засведчыў у дакументах факт знаходжання ў палоне ў час вайны.

Вялікую ролю ў станаўленні кафедры адыграў Я.К.Усікаў. Ён працаваў у інстытуце з 1948 і да канца 1995 года, да апошняга дня свайго жыцця.

У 1950 г. Я.К.Усікаў абараніў дысертацыю і стаў першым у гісторыі кафедры кандыдатам навук. Ужо напрыканцы 40-х гадоў вызначыўся галоўны прадмет яго навуковых інтарэсаў: узнікненне і развіццё беларускай драматургіі, перш за ўсё камедыі. І неўзабаве Я.К.Усікаў становіцца адным з самых дасведчаных і аўтарытэтных у рэспубліцы даследчыкаў азначанай праблемы. Вынікі яго працы былі выкладзены ў манаграфіях "Драматургія Кандрата Крапівы: Нарысы аб станоўчым героі" (1953), "Беларуская камедыя: Ля вытокаў жанру" (1964), "Беларуская камедыя" (1973), "Беларуская камедыя: Літаратурна-крытычныя нарысы" (1979), "Андрэй Макаёнак: Нарыс жыцця і творчасці" (1984), а таксама ў зборніку літаратурна-крытычных артыкулаў "Грамадзянскае сумленне мастака" (1976).

Апроч таго, пяру Я.К.Усікава належаць раздзелы ў падручніках і дапаможніках для студэнтаў ВНУ "Беларуская дзіцячая літаратура" (1966), "Беларуская вусна-паэтычная творчасць" (1966), "Гісторыя беларускай літаратуры. XIX — пачатак XX ст." (1981), "Гісторыя беларускага тэатра" (1983) і каля сотні артыкулаў і рэцэнзій. Гэта быў важкі ўклад у развіццё беларускага літаратуразнаўства. Да меркаванняў Я.К.Усікава прыслухоўваліся і ў асяроддзі даследчыкаў гісторыі літаратуры, і ў СП БССР, членам якога ён быў з 1951 года.

Слынны навуковец, выдатны выкладчык і чалавек, Я.К.Усікаў з 1948 па 1976 год практычна пастаянна ўзначальваў кафедру. Нямала было зроблена за гэты час у плане павышэння метадычнага ўзроўню



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

правядзення заняткаў. І тут загадчык кафедры, які чытаў галоўным чынам курс гісторыі беларускай літаратуры ад старажытнасці да пачатку XX стагоддзя ўключна, быў прыкладам для сваіх калег.

Тады ж распачалася і праца над агульнакафедральнымі тэмамі даследаванняў, вынікам якой стаў, у прыватнасці, выхад у свет вучэбнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ "Беларуская дзіцячая літаратура" (1966, 1980).

Шмат увагі надаваў Я.К.Усікаў падбору і павышэнню кваліфікацыі кадраў, якія, як вядома, вырашаюць усё. Шукаў і знаходзіў будучых выкладчыкаў не толькі сярод дыпламаваных спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, але і сярод аспірантаў, найбольш таленавітых настаўнікаў, выпускнікоў філалагічнага факультэта. Менавіта ў азначаны перыяд на кафедру прыйшлі А.А.Макарэвіч, М.Б.Яфімава, М.Р.Міхайлаў, М.П.Луфераў, В.І.Атрашкевіч, М.В.Няхай, Я.І.Клімуць, М.М.Караткоў.

Вядомым у рэспубліцы вучоным стаў Аляксандр Антонавіч Макарэвіч, які працаваў на кафедры з верасня 1949 года да заўчаснай смерці ў перадапошні дзень 1967 года.

А.А.Макарэвіч выкладаў уводзіны ў літаратуразнаўства, беларускі фальклор, гісторыю беларускай дакастрычніцкай літаратуры. У канцы 1954 г. ён абараніў дысертацыю на тэму "Сатыра Кандрата Крапівы (1922 — 1941 гг.)", якая стала асновай манаграфіі "Сатыра Кандрата Крапівы" (1962). Склаў і выдаў "Кароткі літаратуразнаўчы слоўнік" (1963, 1969). Але галоўным напрамкам навуковай дзейнасці А.А.Макарэвіча стала даследаванне творчасці Я.Купалы, найперш такой шматграннай праблемы, як "творчасць Я.Купалы і фальклор". Ёй прысвечаны манаграфіі "Ад песень і думак народных" (1965) і "Фальклорныя матывы ў драматургіі Янкі Купалы" (1969). Апроч таго, гэты даследчык быў аўтарам асобных раздзелаў у падручніках і вучэбных дапаможніках для ВНУ рэспублікі "Беларуская дзіцячая літаратура" і "Беларуская вуснапаэтычная творчасць" (1966), шматлікіх артыкулаў і рэцэнзій.

У 1961 — 1963 гг. А.А.Макарэвічу давялося выконваць абавязкі дэкана філалагічнага факультэта, загадчыка кафедры беларускай літаратуры. Ён узначальваў бюро секцыі літаратуры і мастацтва Магілёўскага абласнога таварыства "Веды", з 1960 г. быў членам СП БССР.

Адзінаццаць гадоў, з 1955 па 1966 гг., плённа працавала на кафедры пасля заканчэння аспірантуры пры БДУ Маргарыта Бары-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

саўна Яфімава, адна з пачынальнікаў даследавання гісторыі беларускай дзіцячай літаратуры. Яна першай на кафедры пачала весці заняткі па гэтай дысцыпліне. Чытала таксама курс гісторыі беларускай савецкай літаратуры, выкладала практыкум па выразным чытанні.

У 1956 г. М.Б.Яфімава абараніла кандыдацкую дысертацыю, а пазней выдала манаграфіі "Янка Маўр" (1960) і "Беларуская дзіцячая літаратура" (1965). Яна прымала самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы вучэбнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ "Беларуская дзіцячая літаратура" (1966, 1980), была адным з рэдактараў і аўтарам трох раздзелаў гэтага выдання. Апроч таго, апублікавала шэраг артыкулаў. З 1966 г. працягвала педагагічную і навуковую дзейнасць у БДУ.

Аўтарытэтным даследчыкам гісторыі беларускай савецкай літаратуры, перш за ўсё прозы К.Чорнага, быў Мікола Пятровіч Луфераў, член СП БССР з 1971 года. Ім былі напісаны брашура "Кузьма Чорны" (1960) і манаграфія "Проза Кузьмы Чорнага" (1961), раздзелы ў кнігах "Праблемы сучаснай беларускай прозы" (1967), "Гісторыя беларускай савецкай літаратуры" (1964) і ў падручніку для філалагічных факультэтаў педінстытутаў "Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. 1917 — 1940" (1981), каля паўсотні артыкулаў.

Станаўленне М.П.Луферава як вучонага і выкладчыка таксама звязана з кафедрай беларускай літаратуры Магілёўскага педінстытута, на якой ён, былы выпускнік гэтага інстытута, працаваў пасля заканчэння аспірантуры пры Мінскім педінстытуце з 1954 па 1958 год. Тут у 1956 г. М.П.Луфераў абараніў дысертацыю, адсюль перайшоў на працу ў Інстытут літаратуры АН БССР; сюды ж вярнуўся дацэнтам і з 1967 па 1975 год чытаў курсы ўводзін у літаратуразнаўства, гісторыі беларускай савецкай літаратуры, тэорыі літаратуры.

Больш за трыццаць гадоў, (з 1962 па 1994) працаваў на кафедры заслужаны работнік народнай адукацыі Беларусі, член Саюза журналістаў СССР дацэнт Міхаіл Рыгоравіч Міхайлаў. Ён вёў курсы методыкі выкладання беларускай літаратуры, гісторыі беларускай літаратуры, беларускай дзіцячай літаратуры. На працягу доўгага часу кіраваў правядзеннем педагагічнай практыкі на рускім і беларускім аддзяленнях філалагічнага факультэта. Аказваў дзейсную дапамогу абласному інстытуту павышэння кваліфікацыі настаўнікаў.

Асноўным прадметам навуковых даследаванняў М.Р.Міхайлава былі методыка выкладання беларускай літаратуры і беларуская дзіцячая



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

літаратура. Адзін з лепшых у рэспубліцы метадыстаў, ён удзельнічаў у складанні тыпавых вучэбных праграм па гэтых дысцыплінах. Выдаў "Практыкум па методыцы выкладання беларускай літаратуры" (1968, 1979), быў аўтарам раздзелаў у дапаможніках для студэнтаў ВНУ "Методыка выкладання беларускай літаратуры" (1986), "Дзіцячая літаратура" (1996), а таксама каля сотні літаратурна-крытычных артыкулаў і рэцэнзій.

З 1974 па 1978 год працаваў на кафедры кандыдат філалагічных навук дацэнт Міхаіл Васільевіч Няхай, які пазней стаў выкладчыкам у Мінскім інстытуце культуры. Чытаў курсы ўводзін у літаратуразнаўства, гісторыі беларускай савецкай літаратуры, з 1976 г. загадваў кафедрай, а ў 1977 г. стаў і дэканам філалагічнага факультэта.

Вялікую ролю ва ўмацаванні навуковага патэнцыялу кафедры адыграў кандыдат філалагічных навук дацэнт Валерый Іосіфавіч Атрашкевіч. Выпускнік філалагічнага факультэта Магілёўскага педагагічнага інстытута, ён быў размеркаваны на кафедру беларускай мовы. У 1968 г. перайшоў на кафедру беларускай літаратуры, дзе і працаваў да заўчаснай смерці ў пачатку 1990 года. Выкладаў курсы беларускага фальклору, гісторыі беларускай савецкай літаратуры, тэорыі літаратуры, літаратуры народаў СССР, вёў практыкум па выразным чытанні.

В.І.Атрашкевіч закончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры АН БССР, у 1979 г. абараніў дысертацыю. Асноўны прадмет даследаваня — праблема аўтабіяграфізму ў беларускай мастацкай літаратуры, творчасць Я.Коласа, М.Гарэцкага, Ц.Гартнага. Апублікаваў манаграфію "Ад прататыпа да вобраза: Праблема аўтабіяграфізму ў беларускай прозе 20-х гг." (1984) і каля ста артыкулаў і рэцэнзій.

Таленавіты даследчык і арганізатар, В.І.Атрашкевіч у 1979 г. быў абраны загадчыкам кафедры і працаваў на гэтай пасадзе да апошняга дня свайго жыцця. За гэты час кафедра па ўсіх паказчыках стала адной з лепшых у інстытуце. Яе выкладчыкі вялі калектыўнае даследаванне па тэме "Беларуская літаратура і фальклор", вынікі якога змяшчаліся ў навуковай перыёдыцы, а таксама прымалі чынны ўдзел у рэалізацыі сумесных з АН БССР і ВНУ рэспублікі праектаў стварэння энцыклапедычных выданняў: пяцітомнай "Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва" (1984 — 1987), энцыклапедычнага даведніка "Янка Купала" (1986), шасцітомнага энцыклапедычнага даведніка "Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік" (1992 — 1995).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Разам з тым і ў гэты перыяд вялікая ўвага надавалася навукова-метадычнаму ўзроўню заняткаў, падбору кадраў і павышэнню іх кваліфікацыі; на кафедры пачалі працаваць З.А.Суднік, А.М.Макарэвіч, С.С.Украінка, П.М.Камкоў.

У 1990 годзе В.І.Атрашкевіча на пасадзе загадчыка кафедры змяніў Мікалай Мікалаевіч Караткоў. Варта зазначыць, што ў той час кафедра апынулася ў складаным становішчы. Змена пакаленняў выкладчыкаў супала з рэзкім, амаль у два разы, ростам вучэбнай нагрузкі. Значна павялічыўся кантынгент студэнтаў стацыянара і АЗН беларускага аддзялення філалагічнага факультэта, была ўведзена дадатковая спецыяльнасць "Беларуская мова і літаратура" як на рускім аддзяленні філфака, так і на педфаку, факультэце замежных моў. Курс беларускай літаратуры чытаўся і на факультэтах нефілалагічнага профілю. Кадраў не хапала, а спадзявацца на іх прыток аднекуль "збоку" ва ўмовах таго часу не даводзілася.

Выйсце бачылася ў адным — перанесці цяжар выкладання асноўных дысцыплін на найбольш падрыхтаваных членаў кафедры, запрашаць да супрацоўніцтва на ўмовах сумяшчальніцтва дыпламаваных спецыялістаў з іншых ВНУ рэспублікі, а таксама лепшых настаўнікаў вобласці. А галоўнае — размяркоўваць на кафедру найбольш здольных выпускнікоў і павышаць іх кваліфікацыю праз аспірантуру. Так і рабілася на працягу многіх гадоў.

У гэты перыяд вельмі істотную дапамогу кафедры аказалі дактары філалагічных навук М.М.Мішчанчук і А.М.Ненадавец, кандыдаты філалагічных навук М.П.Кенька, К.Р.Хромчанка. Да кіраўніцтва педпрактыкай прыцягваліся метадысты абласнога Інстытута ўдасканалення настаўнікаў Л.С.Кутузава, Л.П.Лазарчык і многія лепшыя настаўнікі школ горада. Усё гэта разам з напружанай працай штатных выкладчыкаў (найперш — кандыдатаў філалагічных навук, дацэнтаў Я.І.Клімуця і А.М.Макарэвіча, старшых выкладчыкаў П.М.Камкова, С.С.Украінкі, З.А.Суднік) і загадчыка кафедры дазволіла не знізіць навукова-метадычны ўзровень выкладання.

Адначасова вялася падрыхтоўка маладых кадраў. У 90-х гадах на кафедру прыйшлі выпускнікі Магілёўскага педінстытута М.І.Чмарава, С.І.Даніленка, Т.І.Борбат, Н.М.Лебедзева, І.М.Кульбянкова, А.В.Шарапава, Ж.С.Церахава, В.І.Караткевіч, В.І.Еўмянькоў. Усе яны пачыналі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

працаваць выкладчыкамі і здавалі кандыдацкія мінімумы, а потым павышалі навуковую кваліфікацыю ў мэтавай аспірантуры. Былі прымацаваны да кафедры і сталі яе рэзервам аспіранты Т.І.Балдышэўская і Л.Г.Бараноўская (2000), А.М.Сярова (2002). накіраваныя на вучобу ўстановамі народнай адукацыі. Выкарыстоўвалася магчымасць пасылаць дыпламаваных спецыялістаў у дактарантуру, на стажыроўку.

Паступова становішча з кваліфікацыяй і, адпаведна, з навуковай работай змянялася да лепшага. За перыяд з 1990 па 2003 гг. было абаронена чатыры кандыдацкія і адна доктарская дысертацыя.

На мяжы XX і XXI стст. канчаткова афарміліся асноўныя напрамкі даследаванняў: літаратура і фальклор (Ж.С.Церахава, Т.І.Балдышэўская, Л.Г.Бараноўская), жанравая і стылёвая сістэма беларускай прозы XX ст. (А.М.Макарэвіч, М.М.Караткоў, І.М.Кульбянкова, С.С.Украінка, Т.І.Борбат, А.В.Шарапава, А.М.Сярова), беларуская літаратура ў кантэксце постмадэрнізму (В.І.Караткевіч), літаратурная ўзаемасувязь у славянскіх літаратурах XIX – XX ст. (Я.І.Клімуць, С.І.Даніленка, М.І.Чмарава, В.І.Еўмянькоў). Вызначылася агульнакафедральная навуковая тэма "Літаратурны працэс у сучасным навуковым асвятленні".

Вынікі навуковай працы выкладчыкаў кафедры за перыяд з 1948 па 2003 гг. прадстаўлены прыблізна ў 708 публікацыях, у тым ліку ў 9 манаграфіях, 1 літаратуразнаўчым слоўніку, 2-х выпусках практыкума, 111 артыкулах у энцыклапедычных выданнях, 22 раздзелах у падручніках для ВНУ, 11 метадычных рэкамендацыях да практычных і семінарскіх заняткаў, 6 праграмах для ВНУ і школ, 3 вучэбна-метадычных дапаможніках і інш.

Традыцыйна супрацоўнічаючы з беларускімі калегамі, выкладчыкі кафедры наладжвалі сувязі і з літаратуразнаўцамі Расіі, Украіны, Польшчы, Чэхіі. Так, у 1994 – 1996 гг. дацэнт А.М.Макарэвіч чытаў лекцыі па гісторыі беларускай літаратуры на філалагічным факультэце Уральскага дзяржаўнага універсітэта ў г.Екацярынбурзе, там жа была выдадзена яго манаграфія "В разных стилевых течениях..." (1995 г.). У 1998 г. стыпендыятам фонда Ежы Гедройца (Парыж) стаў С.І.Даніленка, які прайшоў стажыроўкі ў Варшаўскім (1997, 1998) і Беластоцкім (1998) універсітэтах, Інстытуце славістыкі Польскай Акадэміі навук (1998). У архівах Прагі ў перыяд з 1998 па 2000 гг. працавала М.І.Чмарава, якая даследавала праблему "Бела-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

руская літаратура ў Чэхаславакіі (1920 — 1945)". Усё часцей выкладчыкі выступалі з паведамленнямі на міжнародных навуковых канферэнцыях, у тым ліку і за межамі Беларусі. Дацэнт С.І.Даніленка стаў галоўным рэдактарам незалежнага навуковага квартальніка "Terra alba", а з 1999 г. — і каардынатарам дзейнасці Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў па Магілёўскім рэгіёне. Выкладчыкі кафедры актыўна ўдзельнічалі ў арганізацыі і правядзенні Куляшоўскіх чытанняў, якія сталі цяпер штогадовымі.

Нямала ўвагі ўдзялялася навукова-метадычнай і метадычнай рабоце. Рыхтаваліся і друкаваліся дапаможнікі, вучэбныя праграмы, метадычныя распрацоўкі. Аказвалася дапамога абласному Інстытуту павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў. Чыталіся лекцыі для настаўнікаў (Я.І.Клімуць, А.М.Макарэвіч, М.М.Караткоў, З.А.Суднік, П.М.Камкоў,С.С.Украінка), а таксама праводзіліся заняткі па беларускай літаратуры ў абласным ліцэі, гімназіях, школах. Значная ўвага ўдзялялася і навуковаму асэнсаванню канкрэтных аспектаў методыкі выкладання беларускай літаратуры. Прызнанне сярод метадыстаў, настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, студэнтаў атрымалі метадычныя працы А.М.Макарэвіча. Так, напрыклад, ён на працягу трох год у класічнай гімназіі № 3 г. Магілёва правадзіў эксперыментальнае даследаванне па праблеме вывучэння літаратуры па сістэме перспектыўных ліній. Вынікі такой працы апублікаваны ў часопісе "Роднае слова" (1994), "Беларуская мова і літаратура" (2003).

Наладзілася цеснае супрацоўніцтва з Навукова-метадычным цэнтрам вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Міністэрства асветы РБ. Выкладчыкі кафедры (М.М.Караткоў, А.М.Макарэвіч, З.А.Суднік, С.С.Украінка) неаднаразова выступалі ў якасці рэцэнзентаў вучэбных выданняў, галоўным чынам праграм, падручнікаў і хрэстаматый па беларускай літаратуры для сярэдняй агульнаадукацыйнай школы.

Значная ўвага надавалася выхаваўчай рабоце. Многія члены кафедры працавалі куратарамі студэнцкіх груп. Праводзіліся экскурсіі, сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі. Узнікла літаратурнае аб'яднанне "Зніч", нязменным кіраўніком якога стаў дацэнт Я.І.Клімуць. У самым пачатку 90-х гг. дацэнт А.М.Макарэвіч і старшы выкладчык Г.В.Крываблоцкая арганізавалі дзве студэнцкія тэатральныя студыі, якія ажыццявілі шэраг пастановак па матывах твораў класікаў бела-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рускай літаратуры не толькі ў інстытуце, але і на тэатральных сцэнах горада. У 1993 г. сумесна з рэжысёрам В.І.Ермаловічам дацэнт Я.І.Клімуць стварыў тэатр, акцёрамі якога спачатку былі пераважна студэнты філалагічнага факультэта. Цяпер ён загадвае літаратурнай часткай гэтага тэатра, які стаў Народным тэатрам-студыяй "Валянцін".

Даволі актыўна ўдзельнічалі выкладчыкі ў арганізацыі і правядзенні "круглых сталоў", дыспутаў, у рабоце грамадскіх арганізацый. Так, напрыклад, дацэнт Я.І.Клімуць быў адным з ініцыятараў стварэння Таварыства беларускай мовы ў г.Магілёве і РБ, з 1989 па 1999 гг. быў старшынёй Магілёўскай гарадской, а ў 1989 — 1995 гг. уваходзіў і ў склад Рэспубліканскай Рады ТБМ імя Ф.Скарыны.

Зараз кафедра знаходзіцца ў стане навуковага і метадычнага пад'ёму. На ёй працуюць наступныя выкладчыкі.

**Алесь Мікалаевіч Макарэвіч**, загадчык кафедры з чэрвеня 2001 г., доктар філалагічных навук, дацэнт. На кафедры працуе з 1984 года. У 1990-м закончыў аспірантуру і абараніў кандыдацкую, а ў 2000 г., закончыўшы дактарантуру ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы НА РБ (1999), — і першую ў гісторыі кафедры і факультэта доктарскую дысертацыю.

Чытае курсы гісторыі старажытнай беларускай літаратуры, беларускай літаратуры XX ст. і інш.

Асноўны прадмет даследаванняў — станаўленне жанравых форм і іх стылю ў беларускай літаратуры XIX і XX ст. Аўтар манаграфій "В разных стилевых течениях..." (Екацярынбург, 1995), "Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX — пачатку XX ст." (Магілёў, 1999), а таксама 45 іншых навуковых публікацый (у т.л. і ў замежных навуковых выданнях), 5 навуковых перакладаў.

**Яраслаў Іванавіч Клімуць**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт. На сённяшні дзень — адзін з самых вопытных і аўтарытэтных спецыялістаў. На кафедру прыйшоў працаваць яшчэ ў 1975 г. У 1979 г. абараніў дысертацыю. Чытаў курсы ўводзін у літаратуразнаўства, гісторыі беларускай літаратуры, гісторыі беларускай літаратурнай крытыкі, літаратурнага краязнаўства і інш. З 1989 па 2001 год быў дэканам філалагічнага факультэта. Ініцыятар і актыўны ўдзельнік стварэння універсітэцкага літаратурнага музея.

Сфера асноўных навуковых інтарэсаў Я.Клімуця — узаемасувязі славянскіх літаратур, творчасць Я.Купалы і Я.Коласа, сучасная бела-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

руская проза. Ён выдаў манаграфію "Жыццёвасць традыцый: Якуб Колас і руская савецкая паэзія" (Мінск, 1985), мае 186 іншых навуковых публікацый.

**Сяргей Іванавіч Даніленка**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт. На кафедры з 1992 г., дысертацыю абараніў у 1997 годзе. Чытае курсы гісторыі беларускай старажытнай літаратуры, літаратуры XIX ст., літаратуры блізкага замежжа.

Адзін з найбольш перспектыўных навукоўцаў кафедры. Даследуе галоўным чынам праблему сацыяльнай міфатворчасці ў літаратуры. Ёй прысвечаны манаграфія "Міф і Радзіма: Сакралізацыя дзяржавы-Радзімы ў літаратуры польска-беларускага рамантызму" (Мінск, 1999); аўтар 32 навуковых публікацый, частка з якіх змешчана ў замежных выданнях.

**Мікалай Мікалаевіч Караткоў**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт. Выкладчык кафедры з 1978 г., дысертацыю абараніў у 1989 г., з 1990 па 2001 год загадваў кафедрай беларускай літаратуры. Чытае курсы ўводзін у літаратуразнаўства, тэорыі літаратуры, гісторыі беларускай літаратуры XX ст. і інш.

Асноўны прадмет навуковых інтарэсаў — творчасць М.Гарэцкага, беларуская літаратура 2-й паловы XX ст. Аўтар 32 навуковых публікацый.

**Іна Мікалаеўна Кульбянкова**, кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык. На кафедры працуе з 1993 г., у 2001 г. абараніла дысертацыю. Выкладае гісторыю беларускай літаратуры XX ст. і беларускую дзіцячую літаратуру.

Аўтар 1 вучэбна-метадычнага дапаможніка, 15 артыкулаў, прысвечаных галоўным чынам розным аспектам творчасці З.Бядулі.

**Марына Іванаўна Чмарава**, кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык. На кафедры працуе з 1990 года. У 2003-м абараніла дысертацыю. Чытае курсы гісторыі старажытнай беларускай літаратуры, беларускай літаратуры XIX ст. і 1900 — 1928 гг.

Асноўны прадмет даследаванняў — беларуская літаратура ў Чэхаславакіі ў 20 — 30-я гады, узаемадзеянне беларускай і чэшскай літаратур у гэты перыяд. Вынікі навуковых даследаванняў выкладзены ў 16 публікацыях, у т.л. і ў замежных выданнях.

**Пятро Мікалаевіч Камкоў**, старшы выкладчык, на кафедры працуе з 1990 года. Выкладае гісторыю беларускай літаратуры XX ст., практыкум па выразным чытанні.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Удзельнічаў у стварэнні кнігі "Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Чавускага раёна" (2002), аўтар 10 літаратурна-крытычных артыкулаў.

**Сяргей Сяргеевіч Украінка**, старшы выкладчык. На кафедры з 1989 года. Чытае курсы беларускага фальклору, уводзін у літаратуразнаўства, методыкі выкладання беларускай літаратуры, гісторыі журналістыкі.

Мае 31 навуковую публікацыю; займаецца літаратурнай творчасцю, выдаў зборнік вершаў "Мае купела" (Магілёў, 2001).

**Наталля Мікалаеўна Лебедзева**, старшы выкладчык кафедры з 1993 года. Чытае галоўным чынам курсы беларускай дзіцячай літаратуры, методыкі выкладання беларускай літаратуры, гісторыі беларускай літаратуры на неспецыяльных факультэтах.

**Таццяна Іванаўна Борбат**, старшы выкладчык. На кафедры працуе з 1993 года.

У 2002-м паспяхова закончыла аспірантуру, падрыхтавала да абароны дысертацыю. Аўтар 15 навуковых публікацый, прысвечаных галоўным чынам розным аспектам творчасці С.Грахоўскага.

**Жанна Сямёнаўна Церахава**, старшы выкладчык кафедры з 1997 года. Чытае курс методыкі выкладання беларускай літаратуры.

Заканчвае аспірантуру. Асноўны прадмет даследаванняў — адлюстраванне праяў прыроднай стыхіі ў беларускай літаратуры і фальклоры; аўтар 10 навуковых публікацый.

**Вячаслаў Іванавіч Караткевіч**, працуе выкладчыкам з 1998 года. Чытае курс беларускай дзіцячай літаратуры.

У 2002 г. паспяхова закончыў аспірантуру, падрыхтаваў да абароны дысертацыю. Даследуе спецыфіку адлюстравання рэчаіснасці ў драматургіі мадэрнізму і постмадэрнізму; аўтар 16 навуковых публікацый, у тым ліку і ў зарубежных выданнях.

**Алена Васільеўна Шарапава**, з 1996 г. — выкладчык, з 2001-га — аспірантка кафедры беларускай літаратуры МДУ імя А.А.Куляшова. Даследуе спецыфіку адлюстравання рэчаіснасці ў празаічных наратыўных формах 20 — 30-х гг. XX ст.; аўтар 7 навуковых публікацый.

**Віталь Іванавіч Еўмянькоў**, з 1999 г. — выкладчык, а з 2002-га — аспірант кафедры беларускай літаратуры МДУ імя А.А.Куляшова. Вывучае праблему адлюстравання дыялектыкі дабра і зла ў беларускай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Удзельнічаў у стварэнні кнігі "Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Чавускага раёна" (2002), аўтар 10 літаратурна-крытычных артыкулаў.

**Сяргей Сяргеевіч Украінка**, старшы выкладчык. На кафедры з 1989 года. Чытае курсы беларускага фальклору, уводзін у літаратуразнаўства, методыкі выкладання беларускай літаратуры, гісторыі журналістыкі.

Мае 31 навуковую публікацыю; займаецца літаратурнай творчасцю, выдаў зборнік вершаў "Маё купела" (Магілёў, 2001).

**Наталля Мікалаеўна Лебедзева**, старшы выкладчык кафедры з 1993 года. Чытае галоўным чынам курсы беларускай дзіцячай літаратуры, методыкі выкладання беларускай літаратуры, гісторыі беларускай літаратуры на неспецыяльных факультэтах.

**Таццяна Іванаўна Борбат**, старшы выкладчык. На кафедры працуе з 1993 года.

У 2002-м паспяхова закончыла аспірантуру, падрыхтавала да абароны дысертацыю. Аўтар 15 навуковых публікацый, прысвечаных галоўным чынам розным аспектам творчасці С.Грахоўскага.

**Жанна Сямёнаўна Церахава**, старшы выкладчык кафедры з 1997 года. Чытае курс методыкі выкладання беларускай літаратуры.

Заканчвае аспірантуру. Асноўны прадмет даследаванняў — адлюстраванне праяў прыроднай стыхіі ў беларускай літаратуры і фальклоры; аўтар 10 навуковых публікацый.

**Вячаслаў Іванавіч Караткевіч**, працуе выкладчыкам з 1998 года. Чытае курс беларускай дзіцячай літаратуры.

У 2002 г. паспяхова закончыў аспірантуру, падрыхтаваў да абароны дысертацыю. Даследуе спецыфіку адлюстравання рэчаіснасці ў драматургіі мадэрнізму і постмадэрнізму; аўтар 16 навуковых публікацый, у тым ліку і ў зарубежных выданнях.

**Алена Васільеўна Шарапава**, з 1996 г. — выкладчык, з 2001-га — аспірантка кафедры беларускай літаратуры МДУ імя А.А.Куляшова. Даследуе спецыфіку адлюстравання рэчаіснасці ў празаічных наратыўных формах 20 — 30-х гг. XX ст.; аўтар 7 навуковых публікацый.

**Віталь Іванавіч Еўмянькоў**, з 1999 г. — выкладчык, а з 2002-га — аспірант кафедры беларускай літаратуры МДУ імя А.А.Куляшова. Вывучае праблему адлюстравання дыялектыкі дабра і зла ў беларускай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

літаратуры XIX ст.; аўтар 6 навуковых публікацый. У 2003 г. дэбютаваў як празаік з апавяданнем "Ачмураны паэт" (час. "Маладосць").

**Любоў Георгіеўна Бараноўская**, аспірантка кафедры з 2000 г.; з 2003 — 04 навучальнага года выкладае вучэбную дысцыпліну "Асновы журналістыкі" на аддзяленні журналістыкі. Даследуе мастацкую анімалістыку ў сучаснай літаратуры Беларусі. Аўтар 12 навуковых публікацый.

**Алена Мікалаеўна Сярова**, аспірантка кафедры з 2002 г. Даследуе формаўтваральныя і стылёвыя асаблівасці падзейна-разгорнутага апавядання ў беларускай літаратуры 20 — 50-х гадоў XX ст.; аўтар 2 навуковых публікацый.

Усе станоўчыя тэндэнцыі, якія намеціліся ў рабоце кафедры ў папярэдні перыяд, знаходзяць сваё далейшае лагічнае развіццё. На кафедры створаны тры часовыя навуковыя калектывы, якія працуюць у наступных напрамках: даследаванне гісторыі жанравага развіцця беларускай прозы 20 — 50-х гг. у кантэксце мастацкіх асаблівасцей літаратуры XX ст. (кіраўнік — доктар філ. нав. А.М.Макарэвіч), складанне слоўніка-праспекта энцыклапедыі "Аркадзь Куляшоў" (кіраўнік — дацэнт Я.І.Клімуць), даследаванне архетыпаў і топасаў у сучаснай мастацкай літаратуры Беларусі (кіраўнік — аспірантка Бараноўская Л.Г.). Вынікі даследаванняў выкладчыкаў кафедры вызначаюць змест вучэбных праграм і дапаможнікаў, адлюстраваны ў матэрыялах выступленняў на навуковых канферэнцыях.

Умацоўваюцца сувязі з замежнымі калегамі і навучальнымі ўстановамі. У перыяд з 2001 па 2003 гг. вызначыліся асноўныя напрамкі супрацоўніцтва кафедры беларускай літаратуры і факультэта славянскай філалогіі з навучальнымі ўстановамі Польшчы, Украіны, Расіі. У адпаведнасці з праграмамі супрацоўніцтва былі арганізаваны моўныя стажыроўкі студэнтаў (2001 г. — ва універсітэце г. Лодзі, куратар — доктар філ. нав. А.М.Макарэвіч; 2003 г. — у Беластоцкім універсітэце, куратары — дацэнты С.І.Даніленка, А.С.Лаўшук (дэкан факультэта славянскай філалогіі), доктар філ. нав. А.М.Макарэвіч). У 2003 г. акрэслены напрамкі навуковага супрацоўніцтва паміж кафедрай беларускай літаратуры і кафедрай зарубежнай літаратуры (загадчык — доктар філ. нав., прафесар Лебядзенка Н.П.), кафедрай украінскай літаратуры (загадчык — к.ф.н., дацэнт Райбядзюк Г.Б.) Ізмаільскага гуманітарнага універсітэта.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Па-ранейшаму шмат увагі надаецца падбору і павышэнню кваліфікацыі кадраў, навуковай, навукова-метадычнай і метадычнай рабоце. Так, напрыклад, плануецца накіраванне выкладчыкаў у аспірантуру і дактарантуру, далейшае папаўненне складу кафедры за кошт найбольш здольных выпускнікоў. Тым больш, што ў 2002 – 2003 навучальным годзе быў праведзены набор студэнтаў на новую для факультэта спецыяльнасць "Беларуская мова і літаратура. Журналістыка", а ў 2003 – 04 навучальным годзе – на спецыяльнасць "Журналістыка". Для паспяховай арганізацыі навучання па гэтых спецыяльнасцях была праведзена вялікая падрыхтоўчая праца. Загадчык кафедры, выкладчыкі (В.І.Караткевіч, С.С.Украінка) прымалі актыўны ўдзел у распрацоўцы базавага вучэбнага плана, склалі рабочыя праграмы па дысцыплінах "Уводзіны ў журналістыку", "Асновы літаратурнай творчасці", "Гісторыя журналістыкі", "Тэорыя і методыка журналісцкай творчасці", "Этыка журналісцкай творчасці".

У чэрвені 2003 г. пры кафедры беларускай літаратуры была ўтворана секцыя журналістыкі, працай якой кіруе к.ф.н., дацэнт М.М.Караткоў.

Разам з гэтым працягваецца творчае супрацоўніцтва з абласным Інстытутам павышэння кваліфікацыі (МАІПКіПКРіСА). Чытаюцца лекцыі, распрацоўваюцца метадычныя рэкамендацыі. У прыватнасці, вялікую работу з настаўнікамі вобласці праводзіць загадчык кафедры доктар філ. нав. А.М.Макарэвіч. На курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў ім паспяхова рэалізуецца праграма аўтарскага семінара па праблемах фарміравання ўменняў і навыкаў выканання школьнікамі творчых пісьмовых работ і праверкі іх настаўнікамі ў кантэксце дзесяцібальнай сістэмы ацэнкі дзейнасці вучняў. Змест такога семінара надзвычай актуальны ва ўмовах рэфармавання сярэдняй агульнаадукацыйнай школы; метадычныя рэкамендацыі па ім былі апублікаваны ў 2003 г. у часопісе "Беларуская мова і літаратура" і выклікалі вялікую цікавасць у настаўнікаў і метадыстаў.

Не паслабляюцца сувязі і з Навукова-метадычным цэнтрам вучэбнай кнігі і сродкаў навучання пры Міністэрстве адукацыі РБ. Рэцэнзуюцца рукапісы вучэбных выданняў па беларускай літаратуры. Дацэнт М.М.Караткоў быў уключаны ў склад журы абвешчанага

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Міністэрствам адукацыі рэспубліканскага конкурсу на лепшы падручнік па сацыяльна-грамадскіх дысцыплінах.

Выкладчыкі кафедры праводзяць вялікую выхаваўчую работу сярод студэнтаў. Арганізуюцца экскурсіі ў музеі універсітэта і горада, праводзяцца тэматычныя экскурсіі "Храмы Магілёва", "Горад, якога няма", а таксама экскурсіі па гістарычных і літаратурных мясцінах (Заслаўе, Ляўкі і інш. — дацэнт Я.І.Клімуць, ст. выкладчык С.С.Украінка), культурных цэнтрах Расіі, Украіны (к.ф.н. М.І.Чмарава, ст. выкладчык Н.М.Лебедзева). Мэта такіх экскурсій, перш за ўсё, — пашырэнне кругагляду студэнтаў, паглыбленне ведаў пра родны край, выхаванне патрыятызму, разам з тым — знаёмства з арганізацыяй работы музеяў, магчымымі формамі сумеснай работы музея і педагагічнай установы, што мае істотнае значэнне для падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.

Не менш важна ў гэтым плане і развіццё творчых схільнасцей будучых настаўнікаў да літаратурнай творчасці, мастацкага чытання, самадзейнай акцёрскай і рэжысёрскай дзейнасці. Гэтым і займаюцца студэнты, рыхтуючы і праводзячы пад кіраўніцтвам А.М.Макарэвіча літаратурныя вечарыны, удзельнічаючы ў рабоце Народнага тэатрастудыі "Валянцін", універсітэцкай літаратурнай гасцёўні, літаратурнага аб'яднання "Зніч".

Побач з тым выкладчыкі прымаюць чынны ўдзел і ў грамадскім жыцці. Так, напрыклад, старшы выкладчык Н.М.Лебедзева ўзначальвае абласную арганізацыю ТБМ.

Жыццё між тым не стаіць на месцы, а ставіць на парадак дня ўсё новыя і новыя пытанні. Думаецца, што патэнцыяльныя магчымасці кафедры дазваляюць паспяхова вырашаць дастаткова складаныя задачы навучання і выхавання студэнтаў ва ўмовах рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі.

Кандыдат філ. нав.,
дацэнт М.М.Караткоў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова